УДК 581.93

***А.М. Мялік***
*малодшы навуковы супрацоўнік лабараторыі аптымізацыі экасістэм*
*Палескага аграрна-экалагічнага інстытута НАН Беларусі*

# ПРЫРОДНЫЯ ЎМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ СУЧАСНАЙ ФЛОРЫ ПРЫПЯЦКАГА ПАЛЕССЯ

e-mail: aleksandr-myalik@yandex.by

*Паказваецца залежнасць распаўсюджвання асобных відаў раслін у сувязі з асаблівасцямі геалагічнай будовы тэрыторыі, адметнасцямі яе геамарфалогіі, глебавага покрыва, кліматычных умоў і гідраграфічнай сеткі. На прыкладзе басейнаў сярэдніх рэк (Ясельды, Шчары, Случы, Гарыні, Сцвігі), кожны з якіх мае розную ступень антрапагеннай трансфармацыі ландшафтаў, паказаны ўплыў антрапагенных фактараў на багацце прыроднай флоры.*

## Уводзіны

З навуковай літаратуры вядома, што любая флора непарыўна звязана з тэрыторыяй, на якой яна сфарміравалася і развіваецца, адлюстроўваючы сваім складам як сучасныя фізіка-геаграфічныя ўмовы, так і мінулае прыродных з'яў дадзенага рэгіёна [1]. У сувязі з гэтым пры ўсебаковым аналізе сучаснага складу флоры любой прыроднай тэрыторыі, выяўленні яе характэрных асаблівасцей і тэндэнцый развіцця асобнага разгляду патрабуюць фізіка-геаграфічныя ўмовы дадзенага рэгіёна, асабліва тыя кампаненты прыроды, якія здольныя аказваць уплыў на распаўсюджванне асобных відаў раслін і тым самым вызначаць адметныя фларыстычныя асаблівасці ўсёй тэрыторыі.

У межах паўднёвай часткі Беларусі важнейшым прыродным і гаспадарчым рэгіёнам з'яўляецца Прыпяцкае Палессе [2]. Гэтая асобная фізіка-геаграфічная акруга, размешчаная ў цэнтральнай частцы Палескай правінцыі, у найбольшай ступені адлюстроўвае прыродныя асаблівасці ўсёй Палескай нізіны. Тым самым гэтая тэрыторыя з навуковага пункту гледжання ўяўляе сабой значную цікавасць, паколькі можа быць выкарыстана як мадэльны аб'ект для вывучэння працэсаў змены расліннага покрыва ў межах Палескага рэгіёна, у тым ліку і пад уплывам антрапагенных фактараў.

У сувязі з гэтым мэта дадзенай працы – вызначыць асаблівасці прыродных умоў тэрыторыі Прыпяцкага Палесся і іх уплыў на фарміраванне сучаснай флоры.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вызначыць месца Прыпяцкага Палесся ў сістэмах прыроднага раянавання Беларусі, а таксама выдзеліць кампаненты прыроды, здольныя ўплываць на распаўсюджванне асобных відаў раслін. Асаблівага разгляду патрабуе ацэнка ўплыву тэхнагенных фактараў на багацце флоры, якая развіваецца ў межах ландшафтаў з рознай ступенню антрапагенізацыі.

## Матэрыялы і метады даследаванняў

Для вызначэння ролі сучасных прыродных умоў у фарміраванні флоры Прыпяцкага Палесся выкарыстаны разнастайныя літаратурныя крыніцы [2–9], а таксама матэрыялы ўласных фларыстычных даследаванняў, выкананых на дадзенай тэрыторыі на працягу 2010–2018 гг. Да ўвагі прымаліся агульнапрынятыя падыходы вызначэння ўплыву прыродных фактараў на фарміраванне расліннасці і флоры: асаблівасці геалагічнай будовы і геамарфалогіі, кліматычныя, гідралагічныя і глебавыя ўмовы, а таксама сучасныя тэндэнцыі змянення ландшафтаў пад уздзеяннем антрапагенных фактараў. Для вызначэння ўплыву ступені антрапагеннай трансфармацыі ландшафтаў на багацце прыроднай флоры выкарыстаны басейнавы падыход. Згодна яму разглядаліся флоры басейнаў сярэдніх рэк, размешчаных у межах Прыпяцкага Палесся. Для аналізу выбі-

раліся басейны, тэрыторыі якіх маюць розную ступень антрапагенізацыі, згодна са схемай раянавання Палескай правінцыі па ступені антрапагеннай трансфармацыі ландшафтаў, прапанаванай Г.І. Марцінкевіч [10].

Для выканання падлікаў багацця флоры Прыпяцкага Палесся і басейнаў асобных рэк выкарыстана створаная намі база дадзеных «Флора Прыпяцкага Палесся», якая змяшчае звесткі пра ўсе віды сасудзістых раслін, вырастанне якіх у межах разглядаемай тэрыторыі дакументальна пацверджана на працягу апошніх двух стагоддзяў.

**Вынікі і іх абмеркаванне**

Паводле схемы фізіка-геаграфічнага раянавання Беларусі ў еўрапейскай дзесятковай сістэме Прыпяцкае Палессе – асобная акруга, размешчаная ў цэнтральнай частцы Палескай правінцыі на поўдні Беларусі [3]. Займае яна цэнтральную і ўсходнюю частку Брэсцкай, крайні поўдзень Мінскай і заходнюю частку Гомельскай вобласці. Па даліне р. Прыпяць дзеліцца на Ясельдзінска-Слуцкую і Сярэднепрыпяцкую нізіны. Мяжуе з раўнінай Загароддзе, Высокаўскай і Маларыцкай раўнінамі Брэсцкага Палесся на захадзе, Баранавіцкай і Слуцкай раўнінай Заходняга Перадпалесся на поўначы, Капаткевіцкай раўнінай Гомельскага Палесся на паўночным усходзе, Мазырска-Лельчыцкай раўнінай Мазырскага Палесся на ўсходзе, Жытомірскім і Валынскім Палессем Украіны на поўдні. Плошча Прыпяцкага Палесся складае каля 20 тыс. км$^2$. Працягласць з захаду на ўсход – ад 175 да 280 км, з поўначы на поўдзень – не больш за 140 км. Абсалютныя вышыні мясцовасці знаходзяцца пераважна ў межах 125–140 м над узроўнем мора.

Згодна з нашым падлікам, прыродная флора сасудзістых раслін Прыпяцкага Палесся налічвае 1 450 відаў. Пад прыроднай флорай мы разумеем сукупнасць усіх абарыгенных, а таксама тых адвентыўных відаў, якія ва ўмовах паўднёвай часткі Беларусі вылучаюцца здольнасцю да натуралізацыі, што дазваляе ім вырастаць у межах прыродных экасістэм. Сярод відаў прыроднай флоры 866 таксонаў з’яўляюцца абарыгеннымі, а 584 – адвентыўнымі. Група адвентыўных відаў прадстаўлена пераважна эпекафітамі (здольных да натуралізацыі ў межах парушаных фітацэнозаў) і агрыяфітамі (валодаюць вышэйшай ступенню натуралізацыі) – відамі раслін, якія ўтвараюць стабільны кампанент адвентыўнай флоры. У распаўсюджванні некаторых з гэтых відаў (як абарыгенных, так і заносных) значную ролю могуць выконваць некаторыя прыродныя фактары або наступствы вядзення чалавекам гаспадарчай дзейнасці.

Тэрыторыя Прыпяцкага Палесся размешчана на захадзе Усходне-Еўрапейскай дакембрыйскай платформы. У тэктанічных адносінах яе заходняя частка знаходзіцца ў межах Палескай седлавіны, паўднёва-ўсходняя адпавядае Мікашэвіцка-Жыткавіцкаму выступу, а на паўночным усходзе размяшчаецца Прыпяцкі прагін – буйная адмоўная тэктанічная структура Усходне-Еўрапейскай платформы. З дачацвярцічнымі адкладамі звязаны радовішчы такіх карысных выкапняў, як калійныя солі, будаўнічы і абліцовачны камень, мел і мергель, буры вугаль, гаручыя сланцы і нек. інш. Радовішчы будаўнічых пяскоў, глін, торфу звязаны з адкладамі чацвярцічнага перыяду [5]. Наступствы здабычы некаторых карысных выкапняў непасрэдна адлюстроўваюцца на распаўсюджванні асобных відаў раслін і стане флоры ў цэлым. У прыватнасці, са здабычай калійных соляў у ваколіцах г. Салігорска звязана фарміраванне галафітных раслінных супольніцтваў з удзелам *Puccinellia distans* (Jacq.) Parl., *Spergularia marina* (L.) Griseb. і некаторых іншых солелюбівых відаў [11]. Кар’еры па здабычы будаўнічых пяскоў, глін і некаторых іншых карысных выкапняў садзейнічаюць распаўсюджванню як абарыгенных (*Astragalus arenarius* L., *Filago minima* (Sm.) Pers. і інш.), так і заносных (*Scleranthus annuus* L., *Kochia laniflora* (S.G. Gmel.) Borbás і інш.) відаў псамафітаў, якія вырастаюць на адкрытых пясках.

Некаторы ўплыў на асаблівасць распаўсюджвання груп асобных відаў раслін аказваюць і геамарфалагічныя ўмовы разглядаемай тэрыторыі. Згодна са схемай геамарфалагічнага раянавання Беларусі, дадзены рэгіён знаходзіцца ў межах вобласці Палескай нізіны падвобласці Беларускага Палесся [3]. У паўночнай частцы Прыпяцкага Палесся знаходзяцца Нараўска-Ясельдзінская і Слуцка-Арэская нізіны, Люсінаўская і Лагішынская раўніны. На поўдні і ўсходзе размяшчаюцца Лунінецкая і Жыткавіцкая нізіны, а таксама Столінская раўніна. Адметнасць рэльефу ўсёй Палескай нізіны праяўляецца ў шырокім распаўсюджванні тут дзюнна-пясчаных утварэнняў, якія атрымалі асабліва шырокае распаўсюджванне ў даліне р. Прыпяці [6]. Пясчаныя дзюны і ўзгоркі садзейнічаюць пранікненню і распаўсюджванню тут атлантычна-еўрапейскіх відаў псамафітаў з захаду (*Spergula morisonii* Boreau, *Teesdalia nudicaulis* (L.) W.T. Aiton і інш.), а таксама лесастэпавых і стэпавых відаў (*Chondrilla juncea* L., *Phleum phleoides* (L.) H. Karst., *Jurinea cyanoides* Rchb. і інш.) з усходу [12].

Не меншую цікавасць маюць марэнныя адклады, якія на тэрыторыі Палесся распаўсюджаны абмежавана і прадстаўлены ў асноўным нізкімі градамі і марэннымі плато. Найбольш буйныя акумуляцыі марэн размешчаны на левым беразе Гарыні (паўночна-ўсходняя частка Валынскай грады), у міжрэччы Піны і Ясельды (марэнны выступ Загароддзе), а таксама каля паўночных межаў Прыпяцкага Палесся (краявыя ледніковыя ўтварэнні Беларускай грады). Невялікія марэнныя ўчасткі размешчаны на паўднёвым захадзе ад г.п. Целяханы, у міжрэччы Бобрыка і Вісліцы, а таксама каля г.п. Лагішын. З гэтымі элементамі рэльефу звязана распаўсюджванне некаторых відаў раслін горнай экалогіі (*Lathyrus montanus* Bernh, *Drymochloa sylvatica* (Pollich) Holub і інш.), што надае флоры Прыпяцкага Палесся пэўныя харалагічныя адметнасці.

Важнейшым чыннікам, які ў найбольшай ступені ўплывае на сучасны стан расліннага покрыва і флоры ўсяго Палесся, з'яўляецца клімат. У абагульненым выглядзе кліматычныя адметнасці разглядаемай тэрыторыі вызначаюцца павышанай цеплазабяспечанасцю і паніжанай вільгацезабяспечанасцю ў параўнанні з астатняй часткай Беларусі [7]. У сувязі з гэтым на тэрыторыі Палесся праходзіць паўднёвая мяжа пашырэння такой лесаўтваральнай пароды, як *Picea abies* (L.) Karst. [13], а ельнікі тут увогуле маюць немаральны выгляд, паколькі насычаны некаторымі еўрапейскімі відамі раслін (*Asarum europaeum* L., *Euonymus europaea* L., *Galium odoratum* (L.) Scop. і інш.). Разам з тым менавіта яловыя лясы з'яўляюцца праваднікамі ў флору Палесся некаторых таёжных барэальных відаў раслін (*Goodyera repens* (L.) R. Br., *Moneses uniflora* (L.) A. Gray, *Pyrola chlorantha* Sw. і інш.). Усяго на паўднёвай мяжы свайго натуральнага распаўсюджвання на тэрыторыі Прыпяцкага Палесся знаходзіцца больш за 70 таксонаў, сярод якіх *Lonicera xylosteum* L., *Scheuchzeria palustris* L., *Daphne mezereum* L. і многія іншыя холадаўстойлівыя і вільгацелюбівыя віды [14].

У сваю чаргу, павышаная цеплазабяспечанасць дадзенай тэрыторыі дазваляе расці тут у натуральным стане некаторым цеплалюбівым відам, распаўсюджаным пераважна на поўдні Еўропы, у Міжземнамор'і і Малой Азіі (*Equisetum telmateia* Ehrh., *Juncus capitatus* Weigel, *Salvinia natans* (L.) All. і інш.). Сярод такіх відаў больш за 60 таксонаў знаходзіцца ў Палессі на паўночнай мяжы свайго арэала [14]. Спрыяльныя тэмпературныя ўмовы садзейнічаюць таксама больш імклівому пранікненню і натуралізацыі шматлікіх заносных відаў (*Sideritis montana* L., *Reseda lutea* L. і інш.), а таксама вырошчванню ў культуры шэрагу іншых цеплалюбівых раслін (*Arachis hypogaea* L., *Incarvillea delavayi* Bureau et Franch. і інш.).

Важным кліматычным фактарам, які абумоўлівае распаўсюджванне на тэрыторыі Палесся відаў дзвюх супрацьлеглых экалагічных груп, з'яўляецца кантынентальнасць клімата, якая нарастае з захаду на ўсход [15]. У сувязі з гэтым каля 40 цэнтральна- і атлантычнаеўрапейскіх відаў (*Melittis sarmatica* Klokov, *Succisella inflexa* (Kluk)

Beck, *Saxifraga tridactylites* L. і інш.) знаходзіцца на тэрыторыі Прыпяцкага Палесся на ўсходняй мяжы свайго арэала. Больш чым 20 усходнееўрапейскіх і еўрапейска-сібірскіх стэпавых і лесастэпавых відаў (*Herniaria polygama* J. Gay, *Laphangium luteoalbum* (L.) Tzvelev і інш.), наадварот, знаходзіцца тут на заходнім рубяжы [14].

Некаторыя адметнасці флоры Прыпяцкага Палесся абумоўлены асаблівасцямі гідраграфічнай сеткі. Рэкі, якія працякаюць на дадзенай тэрыторыі, адносяцца да басейна Прыпяці, толькі крайняя паўднёва-заходняя частка знаходзіцца ў межах басейна Заходняга Буга [3]. Галоўнай воднай артэрыяй усяго Палесся з’яўляецца р. Прыпяць са шматлікімі прытокамі. З іх да найбуйнейшых левых адносяцца рэкі Ясельда, Цна, Лань, Случ, да правых – Стыр, Гарынь, Сцвіга, Убарць. Большасць рэк невялікія, яны працякаюць па лясістай забалочанай мясцовасці альбо па асушаных балотных масівах; рэчышчы многіх малых рэк часткова або цалкам каналізаваныя [8]. Асаблівасць уплыву гідраграфічнай сеткі на сучасны стан флоры заключаецца ў тым, што дзякуючы шыротнаму размяшчэнню даліны Прыпяці некаторыя лесастэпавыя і стэпавыя віды (*Jurinea cyanoides* Rchb., *Eryngium planum* L. і інш.) пранікаюць далёка на захад, напрыклад да сярэдняга цячэння р. Ясельды.

Нешматлікія азёры на тэрыторыі Прыпяцкага Палесся характарызуюцца генетычнай разнастайнасцю. Тут прадстаўлены невялікія старычныя (асабліва часта ў даліне Прыпяці), вялікія па плошчы, але неглыбокія азёры-разлівы (Выганашчанскае, Чырвонае), а таксама карставыя азёры (Вулькаўскае, Сомінскае), якія адрозніваюцца невялікай плошчай і значнымі глыбінямі [9]. З асушальнай меліярацыяй звязана вялікая працягласць магістральных каналаў і канаў, значная колькасць вадасховішчаў (Лактышы, Пагост і інш.) і сажалак. Такім чынам, разнастайнасць вадаёмаў садзейнічае фарміраванню багатага па відавым складзе гідрафільнага кампанента флоры, у тым ліку і ў адносінах да рэдкіх і ахоўваемых відаў (*Isoëtes lacustris* L., *Lobelia dortmanna* L., *Caulinia minor* (All.) Coss. et Germ. і інш.).

Прыпяцкае Палессе характарызуецца таксама значнай разнастайнасцю глебаў і рознымі іх прасторавымі спалучэннямі. У большасці раёнаў глебавае покрыва характарызуецца драбнаконтурнасцю, утвараючы пры гэтым складаныя комплексы і мазаікі. Гэта звязана з неаднастайнасцю глебаўтваральных парод, асаблівасцямі рэльефу, розным узроўнем залягання грунтавых вод, а таксама з антрапагеннымі фактарамі [4]. У сістэме глебава-геаграфічнага раянавання Беларусі даследуемая тэрыторыя адпавядае паўднёва-заходняй акрузе паўднёвай (палескай) правінцыі [3]. Паўночная і цэнтральная частка адпавядае Ганцавіцка-Лунінецка-Жыткавіцкаму падраёну тарфяна-балотных і забалочаных пясчаных глебаў. Даліна р. Прыпяць адпавядае Пінскаму падраёну пойменных тарфяных і дзярновых забалочаных глебаў. Тэрыторыя ад Турава ніжняй плыні р. Гарыні да басейна Стыра займае Тураўска-Давід-Гарадоцкі раён дзярнова-карбанатных глебаў, а крайняя паўднёва-ўсходняя частка Прыпяцкага Палесся знаходзіцца ў Столінскім падраёне дзярнова-падзолістых забалочаных супясчаных і тарфяна-балотных глебаў. Частка тэрыторыі, якая знаходзіцца на крайнім паўднёвым захадзе, адпавядае Маларыцкаму падраёну дзярнова-падзолістых забалочаных пясчаных і тарфяна-балотных глебаў.

Выразнай асаблівасцю глебавага покрыва дадзенай тэрыторыі з’яўляецца адносна шырокае распаўсюджванне ландшафтаў з дзярнова-карбанатнымі глебамі. У басейне Прыпяці такія глебы сустракаюцца невялікімі масівамі пераважна ў раёне г. Турава, дзе залягаюць шырокай паласой уздоўж Прыпяці да Сцвігі, а таксама асобнымі плямамі да ніжняга цячэння Гарыні [16]. Пашыраны такія глебы і на захадзе разглядаемай тэрыторыі (Кобрынскі і Драгічынскі р-ны), дзе сустракаюцца невялікімі плямамі ў межах гідрагенна-карбанатных ландшафтных комплексаў [17]. З гэтымі глебамі звязана распаўсюджванне на тэрыторыі Прыпяцкага Палесся шэрагу відаў раслін, якія аддаюць пера-

вагу карбанатным субстратам: *Cypripedium calceolus* L., *Gymnadenia conopsea* (L.) R. Br., *Saxifraga tridactylites* L. і іншыя віды.

Разглядаючы Прыпяцкае Палессе як тэрыторыю, якая характарызуецца падабенствам геалагічных, геамарфалагічных, кліматычных, глебавых і гідралагічных умоў, можна адзначыць генетычнае адзінства яе прыродных кампанентаў. Усё гэта дазваляе вылучыць Прыпяцкае Палессе як асобны прыродна-тэрытарыяльны комплекс [18], размешчаны згодна са схемай ландшафтнага раянавання Беларусі ў складзе Палескай правінцыі азёрна-алювіяльных, алювіяльных тэрасаваных і азёрна-балотных ландшафтаў [3]. Дадзеная правінцыя вылучаецца распаўсюджваннем палескіх (шыракаліста-лясных) ландшафтаў з нізіннымі і сярэдневысотнымі прыродна-тэрытарыяльнымі комплексамі. У межах гэтага рэгіёна атрымалі распаўсюджванне ландшафты марэнных і марэнна-зандравых раўнін, водна-ледавіковых і алювіяльных тэрасаваных раўнін, азёрна-алювіяльных нізін, нерасчлененых рачных далін, а таксама пойменныя ландшафты [18]. Паўночна-заходняя частка разглядаемай тэрыторыі знаходзіцца ў межах Ясельдзінска-Шчарскага раёна плоскахвалістых азёрна-балотных і плоскіх азёрна-алювіяльных ландшафтаў з хвойнікамі; у паўночна-ўсходняй частцы размешчаны Лунінецкі раён плоскіх і плоска-хвалістых азёрна-алювіяльных ландшафтаў з шыракаліста-хваёвымі, чорнаальховымі лясамі, балотамі і лугамі. Паўднёвая частка Прыпяцкага Палесся адпавядае Пінска-Тураўскаму раёну плоскахвалістых алювіяльных тэрасаваных і плоскіх азёрна-балотных і пойменных ландшафтаў з шыракаліста-хваёвымі, хваёвымі, дубовымі лясамі, балотамі і лугамі [19].

Варта адзначыць, што ў выніку працяглага гаспадарчага карыстання прыроднае асяроддзе Прыпяцкага Палесся пацярпела ад значнай антрапагеннай трансфармацыі, што прывяло да змены прыродных ландшафтаў прыродна-антрапагеннымі і тэхнагеннымі, якія валодаюць паніжанай устойлівасцю да антрапагенных нагрузак. Пры гэтым глыбіня тэхнагеннага ўздзеяння на ландшафты залежыць ад віду прыродакарыстання і часу яго станаўлення. Улічваючы працяглую гісторыю гаспадарчага асваення Палесся, асноўнымі відамі прыродакарыстання ў дадзеным рэгіёне варта лічыць наступныя: сельскагаспадарчы, пашавы, лесагаспадарчы, прамысловы і горна-прамысловы, водагаспадарчы, горадабудаўнічы і рэкрэацыйны. Улічваючы накірункі, інтэнсіўнасць і маштабнасць антрапагеннай трансфармацыі зямель, у межах Прыпяцкага Палесся можна вылучыць наступныя тыпы антрапагенна трансфармаваных ландшафтаў: сельскагаспадарчы, сельскагаспадарчы меліяраваны, сельскагаспадарча-лясны і лесагаспадарчы [10; 18].

У Прыпяцкім Палессі распаўсюджаныя ландшафты рознай ступені антрапагенізацыі. Максімальная трансфармацыя ўласцівая другаснамарэнным ландшафтам з сельскагаспадарчым тыпам выкарыстання. Высокай ступенню трансфармацыі характарызуюцца таксама алювіяльныя тэрасаваныя, марэна-зандравыя, другасныя водна-ледавіковыя і азёрна-балотныя ландшафты з сельскагаспадарча-лясным і сельскагаспадарча-меліяраваным тыпам выкарыстання. Другасныя водна-ледавіковыя, азёрна-алювіяльныя і азёрна-балотныя прыродна-тэрытарыяльныя комплексы з сельскагаспадарча-лясным тыпам выкарыстання маюць сярэднюю ступень антрапагеннай трансфармацыі. Нізкая і мінімальная трансфармацыі ўласцівыя для азёрна-балотных і алювіяльных тэрасаваных ландшафтаў з лесагаспадарчым тыпам выкарыстання [10; 18].

Прымяняючы басейнавы падыход з улікам схемы геабатанічнага раянавання Беларусі і ўлічваючы розную ступень антрапагеннай трансфармацыі ландшафтаў, для ацэнкі багацця асобных рэгіянальных флор Прыпяцкага Палесся намі выбраны басейны рэк Ясельды, Шчары, Случы, Гарыні і Сцвігі. У табліцы паказана багацце прыродных флор разглядаемых басейнаў.

Табліца. – Багацце прыродных флор басейнаў некаторых рэк (у межах Прыпяцкага Палесся)

| Рака | Прыродная флора (колькасць відаў) | | | Індэкс адвентызацыі ($I_{adv}$) |
|---|---|---|---|---|
| | Агульная колькасць | Сярод іх | | |
| | | абарыгенныя | адвентыўныя | |
| Ясельда | 1 092 | 677 | 415 | 0,38 |
| Шчара | 876 | 592 | 284 | 0,32 |
| Случ | 748 | 485 | 263 | 0,35 |
| Гарынь | 907 | 595 | 312 | 0,34 |
| Сцвіга | 1 101 | 741 | 360 | 0,33 |

Атрыманыя вынікі паказваюць, што багацце асобных прыродных флор розных басейнаў у цэлым з'яўляецца рэпрэзентатыўным у адносінах да флоры ўсяго Прыпяцкага Палесся: Ясельды – 75,3 %, Шчары – 60,4 %, Случы – 51,6 %, Гарыні – 62,6 %, Сцвігі – 75,9 %.

Пэўныя заканамернасці назіраюцца паміж колькасцю абарыгенных відаў і ступенню антрапагеннай трансфармацыі ландшафтаў басейна. У адпаведнасці з гэтым флора басейна Случы, які мае максімальную ступень антрапагенізацыі, налічвае толькі 485 абарыгенных відаў (56,0 % ад агульнай колькасці абарыгенаў усяго Прыпяцкага Палесся). Флора басейна Сцвігі, тэрыторыя якога ў найменшай ступені трансфармавана чалавекам, налічвае 741 абарыгенны від і тым самым рэпрэзентуе больш за 85 % разнастайнасці абарыгеннай флоры ўсяго Прыпяцкага Палесся.

Важным паказальнікам, непасрэдна звязаным са ступенню антрапагеннай трансфармацыі ландшафтаў, з'яўляецца індэкс адвентызацыі флоры ($I_{adv}$), які выражаецца ў суадносінах адвентыўных відаў да абарыгенных. Для флор басейнаў Шчары і Сцвігі гэты паказальнік з'яўляецца мінімальным (0,32 і 0,33 адпаведна), што можна растлумачыць нізкай і мінімальнай ступенню антрапагеннай трансфармацыі ландшафтаў у межах разглядаемых басейнаў. Адваротная заканамернасць характэрна для басейнаў такіх рэк, як Гарынь, Случ і Ясельда, ландшафты ў межах якіх характарызуюцца дастаткова высокай ступенню антрапагенізацыі. Індэкс адвентызацыі прыроднай флоры гэтых басейнаў дасягае 0,38, што сведчыць пра высокую ступень не прыродных, а антрапагенных фактараў у фарміраванні сучаснай флоры.

**Заключэнне**

Атрыманыя вынікі паказваюць, што прыродныя ўмовы Прыпяцкага Палесся, якія адрозніваюцца разнастайнасцю і некаторай спецыфічнасцю, спрыяюць фарміраванню тут багатай і рэпрэзентатыўнай флоры. Рэпрэзентатыўную флору, згодна з нашымі падлікамі, складаюць 1 450 відаў, здольных вырастаць у межах натуральных экасістэм (сярод іх 866 таксонаў (або каля 60 %) з'яўляюцца абарыгенамі ў дачыненні да флоры цэнтральнай часткі Беларускага Палесся).

У шэрагу асобных прыродных фактараў найбольшы ўплыў на распаўсюджванне некаторых відаў раслін на сучасным этапе развіцця флоры аказвае клімат. Дзякуючы кліматычным асаблівасцям (павышаная цеплазабяспечанасць і паніжаная вільгацезабяспечанасць), дадзеная тэрыторыя з'яўляецца своеасаблівым рубяжом, які, з аднаго боку, стрымлівае распаўсюджванне барэальных відаў на поўдзень, а з іншага – садзейнічае пранікненню цеплалюбівых відаў на поўнач.

У цяперашні час усё большы ўплыў на развіццё флоры аказваюць не прыродныя, а антрапагенныя фактары, што яскрава праяўляецца пры параўнанні рэгіянальных флор тэрыторый, кожная з якіх мае розную ступень антрапагеннай трансфармацыі ландшафтаў. На прыкладзе басейнаў некаторых сярэдніх рэк паказана, што найбольшым багац-

цем і разнастайнасцю вылучаюцца флоры, сфарміраваныя ў межах тэрыторый з нізкай і мінімальнай ступенню антрапагеннай трансфармацыі ландшафтаў. Для гэтых жа флор (басейны Шчары і Сцвігі) характэрны мінімальныя ўзроўні адвентызацыі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Юрцев, Б. А. Флора Сунтар-Хаята. Проблемы истории высокогорных ландшафтов северо-востока Сибири / Б. А. Юрцев. – Л., 1968. – 327 с.

2. Белорусское Полесье : путеводитель : экол.-техн. экскурсия Междунар. семинара «Европейское Полесье – хозяйственная значимость и экологические риски» / В. С. Хомич [и др.]. – Минск : Минсктиппроект, 2007. – 72 с.

3. Нацыянальны атлас Беларусі / Кам. па зямел. рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі пры Савеце Міністраў Рэсп. Беларусь. – Мінск : Белкартаграфія, 2002. – 292 с.

4. Проблемы природопользования в трансграничном регионе Белорусского и Украинского Полесья / В. П. Палиенко [и др.] ; науч. ред. В. П. Палиенко, В. С. Хомич, Л. Ю. Сорокина ; Ин-т географии НАН Украины, Ин-т природопользования НАН Беларуси. – Киев : Сталь, 2013. – 290 с.

5. Геология Беларуси / В. И. Абраменко [и др.] ; под ред. А. С. Махнача [и др.]. – Минск : ИГН НАН Беларуси, 2001. – 815 с.

6. Коржуев, С. С. Рельеф Припятского Полесья / С. С. Коржуев. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1960. – 141 с.

7. Шкляр, А. Х. Климатические ресурсы Белоруссии и использование их в сельском хозяйстве / А. Х. Шкляр. – Минск : Выш. шк., 1973. – 432 с.

8. Блакітная кніга Беларусі : энцыклапедыя / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: Н. А. Дзісько [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1994. – 415 с.

9. Якушко, О. Ф. География озер Белоруссии / О. Ф. Якушко ; под ред. В. Г. Завриева. – Минск : Выш. шк., 1967. – 214 с.

10. Марцинкевич, Г. И. Функциональная типология и структура трансформированных ландшафтов Белорусского Полесья / Г. И. Марцинкевич, И. И. Счасная, И. П. Усова // Земля Беларуси. – 2010. – № 4. – С. 42–48.

11. Парфёнаў, В. І. Фарміраванне галафітных фларыстычных груповак пад уплывам засалення ў наваколлі г. Салігорска / В. І. Парфёнаў, Д. І. Траццякоў // Вес. Акад. навук БССР. Сер. біял. навук. – 1983. – № 6. – С. 3–8.

12. Козловская, Н. В. Анализ флоры сосновых лесов Белорусского Полесья / Н. В. Козловская // Ботаника (исследования) : сб. науч. тр. – Минск, 1977. – Вып. 19. – С. 71–82.

13. Парфенов, В. И. Обусловленность распространения и адаптации видов растений на границах ареалов / В. И. Парфенов. – Минск : Навука і тэхніка, 1980. – 208 с.

14. Мялик, А. Н. Эколого-географические особенности пограничных видов флоры Припятского Полесья / А. Н. Мялик // Ботаника (исследования) : сб. науч. тр. – Минск, 2016. – Вып. 45. – С. 71–82.

15. Мялик, А. Н. Экологический анализ аборигенной флоры Припятского Полесья / А. Н. Мялик // Изв. Гомел. гос. ун-та им. Ф. Скорины. Естеств. науки. – 2016. – № 3 (96). – С. 40–47.

16. Петухова, Н. Н. Геохимия почв Белорусской ССР / Н. Н. Петухова. – Минск : Навука і тэхніка, 1987. – 231 с.

17. Михальчук, Н. В. Гидрогенно-карбонатные ландшафты Полесья: генезис, состояние фитобиоты, охрана / Н. В. Михальчук. – Минск : Беларус. навука, 2015. – 318 с.

18. Клицунова, Н. К. Ландшафты Белорусского Полесья и их антропогенизация под влиянием мелиорации / Н. К. Клицунова, Г. И. Марцинкевич // Проблемы Полесья : сб. науч. тр. – Минск, 1980. – Вып. 6. – С. 226–237.

19. Ландшафты Белоруссии / Г. И. Марцинкевич [и др.] ; под. ред. Г. И. Марцинкевич, Н. К. Клицуновой. – Минск : Універсітэцкае, 1989. – 239 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 09.02.2018

***Myalik A.M.*** **The Natural Conditions of the Formation of the Flora of the Prypiackaje Paliesse**

*The article discusses the influence of natural conditions on the formation of the modern flora of Prypiackaje Paliesse. The dependence of the distribution of individual species in connection with the peculiarities of certain natural components: geology, geomorphology, climate, hydrography, soil cover is shown. For example, basins of medium rivers (Jasełda, Ščara, Sluč, Haryń, Sćviha), each of which has a different degree of anthropogenic transformation of landscapes shows the influence of anthropogenic factors on the abundance of natural flora.*